НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь, твой народ дачакаецца Залацістага, яснага дня!*
*М. Багдановіч.*

№ 14 (126), ЛІСТАПАД 2011 ГОДА

http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна

**ПОГЛЯД РЭДАКТАРА**

# ДА ЛЕНІНА З ВЯНКАМІ

**Сваім першым правадыром савецкай дзяржавы шумілінскае кіраўніцтва, без сумневу, лічыць бальшавіцкага дыктара Уладзіміра Леніна. Яны і сёння жывуць паводле камуністычнага “вучэння”. І кожны год 7 лістапада выказваюць удзячнасць камуністам менавіта за створаную імі дзяржаву “сацыяльна справядлівай сістэмы”.**

Беларусь бадай што, засталася адзінай краінай на постсавецкай прасторы, якая адзначае дзень кастрычніцкага перавароту на дзяржаўным узроўні. Цяперашні рэжым і праўладныя левыя сілы Беларусі па-ранейшаму займаюць непрымірымую пазіцыю. Паводле іх догмаў выходзіць, што бальшавікі пасля рэвалюцыі далі зямлю сялянам, працу рабочым і мір народам.

Напярэдадні сваёй святочнай даты на цэнтральнай плошчы у Шуміліне сабралася невялікая купка людзей. Прадстаўнікі раённай адміністрацыі разам з пенсіянерамі правялі невялікі мітынг, на якім выступіў намеснік старшыні райвыканкама А. Зайцаў. У прыватнасці, ён адзначыў, што дзякуючы кастрычніцкім дням 1917 года “каваўся фундамент у абароне Масквы і перамогі над фашызмам”. Ад імя кіраўніцтва раёна ўсіх ветэранаў вайны і працы павіншавала з 94 гадавінай Кастрычніцкай рэвалюцыі старшыня райсавета Ірына Новікава. Пасля мітынгу яго ўдзельнікаў чакаў святочны канцэрт у раённым Доме культуры, дзе самадзейныя артысты далі рэтра-канцэрт “Песня застаецца з чалавекам”.

Гаварылі шумілінскія чыноўнікі і пра тое, які вынік дала Кастрычніцкая рэвалюцыя для нашай краіны. Так, Ірына Новікава адзначыла, што яркая гістарычная дата – Кастрычнік 1917 года – гэта ёсць “вялікія заваяванні нашых бацькоў і дзядоў”, якія патрэбна шанаваць.

Прыкра і вельмі непрыемна чуць такую лухту ад кіраўнікоў выканаўчай улады ў эпоху свабоднага доступу шматлікіх крыніц масвай інфармацыі. У якім стагоддзі яны жывуць? Нават у афіцыйных савецкіх падручніках пісалася, якія “заваяванні” беларускаму народу прынесла ліхалецце грамадзянскай вайны, пачатак якой паклаў кастрычнік 1917 года. У Беларускай савецкай энцыклапедыі (выдадзена ў 12 тамах у Мінску 1969-1975 г.) ужо былі надрукаваны звесткі пра масавае вынішчэнне бальшавікамі лепшых прадстаўнікоў беларускага народу. Паводле афіцыйных дадзеных, у Беларусі было забіта карнікамі НКВД звыш 600 тысяч рабочых і сялян, 40 наркомаў, 179 вышэйшых кіраўнікоў савецкага апарату, 1 акадэмік, 25 навукоўцаў, 41 выкладчык ВНУ, 460 літаратараў, паэтаў і пісьменнікаў. Трагічна абарвалі сваё жыццё і стваральнікі БССР – прадстаўнікі савецкага ураду Зміцер Жылуновіч (Цішка Гартны) і Аляксандр Чарвякоў. Насамрэч у 1918 годзе была знішчана сапраўдная народная ўлада – карнымі атрадамі расейскіх бальшавікоў былі здзейснены гвалтоўны разгон Першага Усебеларускага з’езду. Гэта была ліквідацыя БНР – Беларускай Народнай Рэспублікі. Кастрычніцкі пераварот прывёў да ўлады партыю, якая здрадзіла нашаму народу. Дастаткова прыгадаць ганебны Брэсцкі мір (сакавік 1918 г.), падчас якога бальшавікі (па іцыятыве і настаянню Леніна) перадалі нямецкім акупантам 2/3 беларускай зямлі.

Адмаўленне фактаў бальшавіцкага тэрору зневажае мільёны беларусаў, а сама наяўнасць помнікаў дыктатару Леніну з’яўляецца вялікім цынізмам і зневажаннем гістарычнай памяці. Святкаванне кастрычніцкага перавароту ганьбіць нашу краіну на ўвесь свет і прыносіць велізарныя страты цэламу народу. І тыя кіраўнікі, якія гэтага не разумеюць, ніколі не стануць на шлях цывілізаванага развіцця.

Само жыццё падказвае, што былыя камуністы і асабліва іх цяперашнія нашчадкі даўно павінны быць адпраўлены на звалку гісторыі. Раніцай 7 лістапада на плошчы Незалежнасці ў Мінску сабраліся каля ста прыхільнікаў Камуністычнай партыі Беларусі (КПБ). Яны ўсклалі кветкі да помніка Леніну ў гонар 94-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Акцыя доўжылася 15 звілін. Прыйшло ўсяго каля сотні чалавек з двухмільённага горада? І гэта ў той час, калі дзень 7 лістапада афіцыйна аб’яўлены выхадным у гонар дзяржаўнага свята!

Шанаванне дзеючымі ўладамі помнікаў расейскім камуністычным дыктатарам і адсутнасць спробаў вырашыць гэта пытанне цывілізаванымм шляхам, стварае глебу для грамадскага напружання. Прыкладам вырашэння пытання помнікаў савецкай эпохі могуць служыць суседнія дэмакратычныя краіны. У Літве, напрыклад, усе камуністычныя ідалы звезены з гарадоў у асобнае месца, дзе створаны музей савецкай акупацыі. Ці не наспеў час нашым чыноўнікам, мякка кажучы, трапляць у нялёмкую сітуацыю каля помніка крываваму кату? Вянок з калючага дроту яму на шыю.

**Аляксандр Шчамлёў.**

**КУЛЬТУРНАЯ ПАДЗЕЯ**

# Алег Салтук сустрэўся з землякамі

На Шумілінршчыну ў госці да сваіх землякоў зноў завітаў вядомы паэт Алег Уладзіміравіч Салтук. Сустрэча з моладдзю праходзіла ў памяшканні Кардонскай сельскай бібліятэкі.

Паэт выступіў перад вучнямі старэйшых класаў і мясцовымі аматарамі паэзіі. У нашым раёне яго добра ведаюць, многія чытачы знаёмы з яго творчасцю. На сустрэчы з чытачамі Алег Уладзіміравіч успамінаў сваё дзяцінства і пачатак юнацтва, якое прайшло на радзіме маці. Ён нарадзіўся ў вёсцы Рыжэнькі ў сям’і патомных хлебаробаў.

Прысутныя пачулі расповед аб тым, як пачыналася творчая дзейнасць паэта, сказаная ў дзесяці паэтычных кніжках, у сотнях артыкулаў, надрукаваных на старонках розных газет. Як натхняюць да творчасці незабыўныя краявіды, любыя сэрцу мясціны, дзе помніцца ўсё да маленькай пясчынкі.

Падзяліліся на сустрэчы сваімі успамінамі і землякі паэта, яго родныя. Паэта прыемна здзівіла выстава, прысвечаная яго юбілею – сёлета Алегу Салтуку, ганароваму грамадзяніну Шуміліна споўнілася 65 гадоў. Паэт у роскваце сваіх паэтычных сіл. Сведчанне таму – нядаўні выхад новай ягонай кніжкі вершаў і паэм “Дзве зары”. Яго журналісцкая праца адзначана “Залатым пяром”.

Напрыканцы мерапрыемства адбыўся невялікі канцэрт, на якім самадзейныя артысты выканалі любімыя песні.

**Алесь Прыбярэжны.**

## “СВІТАНАК” У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчаецца на партале *http://kamunikat.org/*, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: *http://kamunikat.org/svitanak.html*, што у каталагу “Пэрыёдыка” для далейшага выкарыстання яшчэ да з’яўлення газеты на паперы.**

**ЖЫВІ ЯК ГАСПАДАР**

# ЦІ БУДУЦЬ ГАТОВЫЯ ДРОВЫ?

**З наступленнем халадоў попыт на дровы значна павялічыўся. Здавалася б, руплівыя гаспадары павінны былі загадзя нарыхтаваць паліва яшчэ сёлетняй вясною ў сакавіку-красавіку. Хочаш гатовыя дровы? Калі ласка – плаці грошы і прывязуць. Аднак далёка не ўсё залежыць ад спажыўцоў.**

Сітуацыя з палівам настолькі напружная, што пытанне нарыхтоўкі дроў разглядался на пасяджэнні райсавета, якое праводзіла старшыня Ірына Новікава. Справаздачу перад дэпутатамі рабіў дырэктар райпаліўзбыту Уладзімір Кійко. Найбольшая колькасць нявырашанных пытанняў тычыцца несвоечасовага забяспячэння жыхароў раёна палівам – брыкетам або дровамі.

Па-першае, з-за ўзросшых цэн на паліва, у тым ліку і на дровы, узніклі фінансавыя праблемы. Запланаваных сродкаў з раённага бюджэту на рахунак райпаліўзбыту паступіла 312, 5мільёна рублёў. На датацыю кошту паліва насельніцтву гэтага яўна недастаткова. Па-другое, у Шумілінскім філіяле абласнога ўнітарнага прадпрыемства “Віцебскаблпаліў” утварылася вялікая чарга па забяспячэнню насельніцтва палівам – каля 700 чалавек.

Ды і цэны на паліва нават з датацыяй у гэтай арганізацыі высокія. Так, адзін кубаметр дроў двухмятровымі хлыстамі ўжо каштуе 40 тысяч рублёў. За кожны кіламетр дастаўкі ў адзін бок трэба заплаціць 4 тысячы рублёў. Зыходзячы з нормы на адно домаўладанне ( 4,5 кубаметраў) машына дроў абыйдзецца гаспадару ад 350 да 400 тысяч рублёў.

За дзевяць месяцаў бягучага года райпаліўзбыт рэалізаваў 2458 кубаметраў дроў для 469 домаўладанняў па фіксаваных цэнах. У тым ліку толькі 20 кубоў па свабодных цэнах. І хаця чарга вялікая, але дровы па свабодных цэнах людзі ўпарта не бяруць, бо надта дорага.

На пасяджэнні прэзідыума райсавета былі нараканні ў адрас кіраўніцтва лясгасу (дырэктар І. Папок). Лясгас не выканаў дагавор на пастаўку дроў райпаліўзбыту. На сённяшні дзень для адпраўкі спажыўцу ляжыць 40 кубоў драўніны. Калі справа такімі тэмпамі пойдзе далей, дык чарга на дровы вырасце яшчэ больш.

Але ж дровы – гэта нявыгадная справа для лясгасу, якая акрамя стратаў нічога не дае. Асноўны накірунак дзейнасці прадпрыемства – нарыхтоўка дзелавой драўніны на экспарт. Тым не менш, у лесе засталося 13 тысяч кубічных метраў дроў. Але тут зноў паўстаюць праблемы: дровы ляжаць у цяжкадаступных месцах, акрамя таго, для іх вывазу не хапае адзінак тэхнікі.

І нарэшце, ёсць надзея на апошні варыянт – саманарыхтоўка, гэта значыць уласнымі сіламі. Чалавек бярэ пілу і сякеру, ідзе ў лес, сам спілоўвае дровы, якія пакажа ляснік, і потым самастойна дастаўляе іх дамоў. Так некалі нашы дзяды рабілі. Аднак цяпер прынцыпы саманарыхтоўкі крыху іншыя. Дзялянку прыватнаму нарыхтоўшчыку могуць выдзеліць не заўсёды паблізу той вёскі, каля якой ён жыве. Пры гэтым спажывец павінен сам прыводзіць дзялянку ў парадак. Праўда, тут ёсць адна немалаважная акалічнасць. Згодна з правіламі бяспекі, работы ў лесе, валка дрэў дазваляецца толькі людзям, якія маюць для гэтага спецыяльны допуск – вальшчыкі, работнікі лясной аховы. Усе іншыя аперацыі па нарыхтоўцы дроў: раскрыжоўка, зсяканне голля, складзіраванне ў раўметры, уборка тэрыторыі і дастаўка да дому праводзяцца самім заказчыкам. Такім чынам ужо нарыхтавана 8 тысяч кубоў дроў.

Але аднаго жадання займацца саманарыхтоўкай недастаткова. Не ў кожнага ёсць свой трактар ці конь. Само сабой, што на распілоўку калодак больш за 30 см патрэбна прафесійная бензапіла. Вёска імкліва старэе, адпаведна скарачаецца колькасць працаздольнага насельніцтва. Што рабіць тым, якія не маюць магчымасці самастойна выехаць у лясныя масівы? Дровы можна заказаць праз сельсавет пры ўмове, калі ў бліжэйшым лесе ёсць нарыхтаваныя дровы і ўжо папілены на цуркі. Але ў гэтым выпадку кошт пяці кубічных метраў складзе каля 600 тысяч рублёў, не кажучы ўжо пра свабодную цану. У сувязі з гэтым прэзідыум райсавета зацвердзіў рэкамендацыі па ільготах для насельніцтва на 2012 год. Але хто дасць гарантыю, што на пачатку наступнага года цэны зноў не падскочуць удвая, а ў бюджэце хопіць сродкаў?

**Алесь Шумскі.**

## АБ’ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бясплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя «Світанка» змяшчае бясплатныя абвес-ткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

У ЦЭНТРЫ УВАГІ

# Нелегітымная ўлада – асноўная прычына росту злачыннасці

**На чарговым пасяджэнні Шумілінскага райвыканкама былі ўзняты праблемы барацьбы з карупцыяй і злачыннасцю. Нягледзячы на прынятыя меры, у раёне па-ранейшаму назіраецца ўстойлівы рост злачыннасці.**

Паводле пракурора раёна Я. Гуляева, з пачатку года ў нашым раёне афіцыйна зарэгістраваны рост злачыннасці – здзейснены 253 злачынствы ( супраць 230 у мінулым годзе). Па лініі крымінальнага вышуку колькасць злачынстваў узрасла са 167 у мінулым годзе да 179 у бягучым годзе.

У большасці выпадкаў рост злачыннасці па лініі крымінальнага вышуку адбыўся з-за павелічэння колькасці крадзяжоў. У мінулым годзе іх было зафіксавана 128 выпадкаў, а сёлета ўжо 143. Пагатоў, эканамічная абстаноўка ніяк не спрыяе змяншэнню колькасці дробных крадзяжоў. Даволі нізкі ўзровень працоўнай дысцыпліны, недастатковыя меры па прафілактыцы правапарушэнняў прыводзяць да безгаспадарчасці. Людзі ў працоўных калектывах не зацікаўлены ў збераджэнні дзяржаўнай маёмасці. А калі яшчэ працаўнікі і п'юць на рабочым месцы, тады аб якой адказнасці суб'ектаў гаспадарання да сваёй маёмасці можа ісці гаворка?

Не суцяшае і станоўчая тэндэнцыя да змяншэння гэтак званых карупцыйных злачынстваў. Хаця такіх злачынстваў паменела утрая, аднак нанесены матэрыяльны ўрон у памеры 37,5 мільёна рублёў. На думку пракурора Я. Гуляева ёсць недахопы ў рабоце групы па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю РАУС. Разам з тым іншыя адпаведныя службы раёна праводзяць недастаткова зладжаную і эфектыўную работу па папярэджанню карупцыі.

Праўда, трэба аддаць належнае калектыву шумілінскай міліцыі. За апошнія дзевяць месяцаў не дапушчана забойстваў, а колькасць асабліва цяжкіх злачынстваў знізілася з 17 да 9.

У найбольш агульным сэнсе карупцыю можна вызначыць як выкарыстанне службовай асобай свайго становішча ў мэтах атрымання асабістай выгады. Несумненна, карупцыя падрывае давер народа да ўлады, дыскрэдытуе дзяржаўныя органы, падрывае рыначныя мезанізмы сумленай канкурэнцыі ў эканоміцы.

Аднак барацьба з карупцыяй і злачыннасцю можа быць эфектыўнай у тым выпадку, калі захоўваецца прынцып непазбежнасці пакарання. На жаль, гэта немагчыма пры таталітарным рэжыме, у багне якога апынулася наша краіна. Калі няма дэмакратызацыі, ва ўладзе дзесяцігоддзямі пануюць адны і тыя ж кіраўнікі, якія яшчэ і самі сябе прызначаюць, чыноўнікаў вельмі цяжка прыцягнуць да адказнасці. Прынамсі, і міліцыя, і пракуратура, і суд не будуць незалежнымі, не змогуць у сваёй дзейнасці прытрымлівацца законаў. Закон будзе падменены гэтак званым "тэлефонным правам".

Адзіны выхад – гэта калі ўладу будзе кантраляваць грамадзянская супольнасць, незалежныя медыі, мясцовыя дэпутаты. Калі выбаршчыкі будуць мець права выбіраць сабе прадстаўнікоў выканаўчай улады на альтэрнатыўнай аснове адзін раз у чатыры гады, то кіраўнік будзе несці адказнасць перад народам. Пачнецца канкурэнцыя сярод кандыдатаў на дзяржаўную пасаду, што прывядзе да абнаўлення кіраўнічых кадраў. А пакуль гэтага няма, карупцыянеры адчуваюць сябе ў камфортных умовах.

**Алесь Шумскі.**

ЖЫВІ ЯК ГАСПАДАР

# ЗНІШЧАНАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ

**Напэўна, не знойдзеш у райцэнтры чалавека, які б быў раўнадушным да яго ўтульнасці, прыгажосці. На жаль, знаходзяцца і такія, якім падабаецца ірваць кветкі, таптаць клумбы, ламаць агароджы. Ужо ў каторы раз у гарадскім парку здарыліся выпадкі вандалізму.**

Не сакрэт, што нашы людзі яшчэ не навучыліся цаніць працу іншых. Нярэдка можна заўважыць, як на вуліцах Шуміліна, нягледзячы на абсталяваныя пешаходныя пераходы, некаторыя шыбуюць прама праз газоны, кустарнікавыя насаджэнні, іншы раз па кветках. Нібыта яны атрымліваюць задавальненне ад таго, што псуюць настрой людзям і надаюць лішнюю працу і без таго перагружаным работнікам камунальнай службы.

Напрыканцы кастрычніка шумілінскія камунальнікі чарговы раз праводзілі работы па аднаўленню гарадскога парку. А работы было нямала ¬– невядомыя, верагодна падлеткі зноў перавярнулі персанажы казачных жывёлін і скінулі ў вадаём. Нават не паляніліся выбіць некалькі секцый новай агароджы, збудаванай з цэменту па вуліцы Сіпко. Між іншым, цяпер матэрыяльныя страты і выдаткі на рамонт цяжарам лягуць на плечы падаткаапплацельшчыкаў усяго раёна.

Міліцыя пакуль што зламыснікаў не знайшла, як няма і сведкаў ганебных учынкаў. Але не можа быць, што іх ніхто не бачыў. Вядома, што адна міліцыя з правапарушальнікамі грамадскага парадку не справіцца, калі грамадзяне не будуць дапамагаць. Бо гэта ў нашых агульных інтарэсах: выяўляць тых, хто перашкаджае нармальна жыць і працаваць законапаслухмяным людзям.

Асабліва хацелася б, каб людзі цанілі ўсё тое, што робіцца ў раёне для іх жа ўтульнасці, прыгажосці роднага краю. Ніхто не павінен быць раўнадушным, калі з такой зайздроснай рэгулярнасцю ў асобных месцах знішчаецца дэкаратыўная агароджа.

**С. Горкі.**

НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ВОЙСКА

# ШУМІЛІНСКІХ ХЛОПЦАЎ ЗБІРАЛІ Ў ВОЙСКА

**Мерапрыемства, прысвечанае чарговаму восеньскаму прызыву на тэрміновую вайсковую службу, урачыста праходзіла ў раённым Доме культуры. У зале сядзела 40 юнакоў, якія атрымалі позвы з райваенкамата.**

Па традыцыі, адкрыў Дзень прызыўніка намеснік старшыні райвыканкама Аляксандр Зайцаў. У невялікай прамове ён расказаў, чаму вучаць маладых людзей у войску, што яны павінны быць гатовымі да пэўных складанасцей, якія толькі загартуюць, навучаць не пасаваць перад жыццём і яго праблемамі.

З гонарам прайсці загартоўку арміяй пажадала прызыўнікам намеснік ваеннага камісара Н. Жандарава. Поспех у службе залежыць ад кожнага, трэба не губляць аптымізм, стрымліваць эмоцыі, гэта дапаможа хутчэй асвоіцца ў новых умовах, атрымаць ваенную спецыяльнасць. А сярод пажаданняўматуль — дастойна прадстаўляць Шумілііншчыну, знайсці надзейных сяброў, з гонарам выканаць грамадзянскі абавязак, не забываць пра родны дом і бацькоў.

Напэўна кожны прызыўнік хацеў, каб і яго матуля атрымала падзячнае пісьмо ў канверце з армейскім штампам.

Працягам урачыстасцей стала шэсце да брацкіх могілак. Прызыўнікі ўсклалі кветкі да да помніка загінуўшым воінам, партызанам і мірным жыхарам у гарадскім скверы.

Хто ж атрымаў позвы на тэрміновую службу ў беларускую армію? Пераважная большасць нававбранцаў – учарашнія выпускнікі сярэдніх школ раёна і прафесійна-тэхнічных вучылішчаў. Прызыўнікі будуць служыць у самых розных вайсковых часцях Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь – танкавых, дэсантных, пагранічных, унутраных. Будзем спадзявацца, што нашы маладыя людзі стануць сапраўднымі салдатамі, не пасаромяць сваіх землякоў.

Алесь Прыбярэжны.

НАША СПАДЧЫНА

# МІШНЕВІЧЫ– КРАЙ НАРОДНЫХ МАЙСТРОЎ

**Пераемнасць лепшых узораў народнай творчасці – менавіта такую задачу ставяць перад сабой народныя ўмельцы. Як сёння захоўваюцца і адраджаюцца народныя рамёствы ў розных кутках раёна?**

Яркі прыклад – вёска Мішневічы, дзе беражліва і з павагай ставяцца да старадаўніх нацыянальных традыцый. Бадай што, ніводная выстава на раённым узроўні не праходзіць без удзелу мішневіцкіх майстроў. Клуб народных майстроў быў створаны дзесяць гадоў таму, калі паступова стаў фарміравацца творчы калектыў. Цяпер калектыў налічвае 15 чалавек, але надта творчы, захоплены сваёю працаю.

Жанчыны займаюцца вышываннем, вязаннем, пры гэтым не маюць мастацкую адукацыю вышывальшчыц ці каруначніц. Навыкі гэтай карпатлівай працы перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Пра словах самай старэйшай (за 80 год) майстрыхі Евы Віднікевіч, яе маці была прафесійнай ткачыхай. Менавіта ад яе Ева Мікітаўна пераняла вопыт і любоў да народных рамёстваў і атрымала ў спадчыну ткацкі станок.

У тыя далёкія часы дзяўчаты хадзілі па вёсцы з кудзелямі, – гэта была даволі распаўсюджаная з'ява. Жанчыны па чарзе сабіраліся то ў адной хатцы, то ў другой і пралі, вышывалі, ткалі. Раней ткалі ўсё – прасціны, ручнікі, адзенне. У асноўным прыходзілі разам са сваімі дзецьмі. Так атрымоўвалася, што тэхналогіі заўсёды развіваліся і перадаваліся малодшаму пакаленню.

І зараз сярод членаў клуба народных майстроў нямала моладзі, асабліва захапляюцца народным рамяством школьніцы. Дзеці любяць ствараць сваімі рукамі прыгажосць, ды і вывучаць узоры вельмі цікава, бо гэта своеасаблівая азбука, кожны арнамент нешта ды значыць.

Кожны член клуба знайшоў сабе справу па душы. Як, напрыклад, Вольга Зуёва, якая захапляецца разьбой па дрэву. Валерый Дарафееў займаецца вырабам драўляных лыжачак і лапатачак. У Антаніны Іванова любімая справа – вышыўка.

У Мішневіцкім клубе адкрыта выстава вырабаў народнай творчасці.Тут назапашана багата матэрыялу. Наведвальнікі могуць пабачыць цэлую калекцыю вышыванак, розных падзелак з дрэва, яркія і каларытныя ткацкія вырабы. Дарэчы, вырабы, выкананыя ўмелымі рукамі старэйшай майстрыхі Евы Віднікевіч былі прадстаўлены на абласным свяце нацыянальнай культуры ў Міёрах. Калекцыя з пакрывалаў, саматканых ручнікоў і прасцін была адзначана дыпломам ў намінацыі "Захаванне народных традыцый". Па ўсяму бачна, што і на Шумілііншчыне, якое традыцыйнае рамяство не возьмеш – яно пачынае актыўна вяртацца з нябыцця і ўключацца ў сучасныя культурныя працэсы.

**Алесь Прыбярэжны.**

НАША ГІСТОРЫЯ

# ЗВЕСТКА З МІНУЛАГА

**Праўдзівы лёс яшчэ аднаго салдата стаў нагодай для грамадзянскай паніхіды ў Амбросавічах. Яго лічылі прапаўшым без вестак 70 гадоў. І вось нарэшце з Германіі прыйшла гэта апошняя вестка той далёкай вайны.**

Гэта гісторыя пачалася ў 1941 годзе, калі ўраджэнец вёскі Непароты Іван Іванавіч Кібісаў адразу пасля тэрміновай службы быў прызваны на фронт. Пад Вязьмай трапіў у акружэнне –на гэтым звесткі пра салдата абрываюцца.

Доўгі час пошукамі сына займалася яго маці Агаф'я Трыфанаўна. Бясконцыя перапіскі і запыты ў архівы станоўчых вынікаў не далі. Да канца свайго жыцця ёй так і не ўдалося дакладна ўстанавіць абставіны яго знікнення.

Сямейную справу ў пошуках блізкага чалавека працягнула пляменніца І. Кібісава – Наталля Кулакевіч. Супрацоўнікі Гарадоцкага і Шумілінскага райвыканкамаў, дырэктар праваслаўнага духоўнага цэнтра В. Ільін сабралі і даследавалі шмат матэрыялаў. Даслалі некалькі запытаў у Германію. З архіваў Германіі прыйшлі дакументы: карты, схемы і фотаздымкі. Як высветлілася, Іван Кібісаў памёр ў канцэнтрацыйным лагеры і пахаваны ў Германіі каля горада Везуве.

У грамадзянскай паніхідзе, якая адбылася ў Амбросавічах, прынялі ўдзел мясцовыя жыхары, настаўнікі і вучні мясцовай сярэдняй школы, вернікі. Яшчэ ў 1974 годзе тут быў адкрыты помнік воінам-землякам. Цяпер на мемарыяльнай пліце было ўвекавечана прозвішча Івана Кібісава з вёкі Непароты.

Увогуле на тэрыторыі Шумілінскага раёна пахавана 10267 чалавек, якія загінулі на вайне, з іх 2217 чалавек – невядомыя. Таму вядуцца пошукі, удакладняюцца лёсы прапаўшых без вестак і імёны загінуўшых. За апошнія пяць гадоў аднаўлены 341 прозвішча савецкіх салдат і партызан. Прынята лічыць, што вайна не скончыцца, пакуль не пахаваны яе апошні салдат або ахвяра.

**У. Амбросаў.**

ГАЛОЎНАЯ ПАДЗЕЯ

# САЎМІН "ЧВАРТАВАЦЬ" НЕЛЬГА ПАМІЛАВАЦЬ

КОСКУ Ў ГЭТЫМ СКАЗЕ НЕЎЗАБАВЕ ПАВІНЕН ПАСТАВІЦЬ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА. ВОСЬ ТОЛЬКІ ДЗЕ Б ЯНА НЕ ЎСТАЛЯВАЛАСЯ, НАЎРАД ЦІ ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧАМУ СТАНЕ ЛЯГЧЭЙ. НЕ ГАВОРАЧЫ ПРА ШЫРОКІЯ НАРОДНЫЯ МАСЫ.

### Прыходзіць у крамы, як у музеі

На пасяджэнні Савета Міністраў 8 лістапада Міхаіл Мясніковіч паспрабаваў даказаць памочніку прэзідэнта Сяргею Ткачову, што эмісійнае фінансаванне дзяржпраграм наносіць наймацнейшы ўдар па эканоміцы краіны. Крыху раней віцэ-прэм'ер Сяргей Румас прызнаў «перабор з аказаннем дзяржпадтрымкі» і раскрытыкаваў ранейшы шлях пампавання грошай у будаўніцтва, з-за якога «ўся краіна за жыллё заплаціла дэвальвацыяй», а інфляцыю ў Беларусі назваў ні больш ні менш як ганьбай для ўрада.

Зваротная рэакцыя з раскрытыкаванага боку не прымусіла сябе чакаць. Ужо ў сераду на нарадзе па пытаннях распараджэння дзяржмаёмасцю Аляксандр Лукашэнка выказаў незадаволенасць рашэннямі ўрада, які, па меркаванні кіраўніка дзяржавы, «значна саступае ранейшаму», і прадрок, што без павышэння заробкаў (чытай — працягу эмісіі) большая частка насельніцтва будзе прыходзіць у крамы, як у музеі — «паглядзець на рынкавую эканоміку Мясніковіча—Румаса».

Уласна кажучы, са спробы адкрыта прызнаць памылковасць ранейшых рашэнняў і, пакуль яшчэ не надта позна (калі?), абраць іншы шлях вырашэння эканамічных праблем, атрымалася ці то гульня ў сапсаваны тэлефон, ці то завочная палеміка ў стылі «хто за каго дурнейшы». Урад даводзіць памочніку прэзідэнта Сяргею Ткачову, што трэба змяншаць тэмпы росту ВУП, у некалькі разоў зніжаць эмісію і як мінімум утрая (12 трыльёнаў рублёў супраць запрошаных 36 трыльёнаў) скарачаць фінансаванне дзяржпраграм, а прэзідэнт абвяшчае, што апошнія прапановы ўрада «ідуць супраць рашэнняў Усебеларускага народнага сходу, што ўжо недапушчальна».

Безумоўна, у нас кожны другі, калі не першы, выдатна разбіраецца ў эканоміцы, і нават у звычайных кухонных баталіях нараджаюцца такія стратэгіі, што любы прафесар пазайздросціць. А ўжо калі гаворка ідзе пра цэлы ўсебеларускі сход, то ён ужо дакладна ведае, чаго хоча народ.

І ўсё ж, вобразна кажучы, зазвычай доктар лепш за пацыента ведае, чым і як лячыць яго хваробу. Безумоўна, калі гэта адукаваны і кваліфікаваны ўрач...

У адказ на крытыку члены ўрада атрымалі ад першай асобы Беларусі абяцанне, якое больш падобнае на самую сапраўдную пагрозу: «мы прааналізуем у Адміністрацыі ўсю вашу працу — публічную, непублічную — і потым дамо вам ацэнку». Адразу папаўзлі чуткі, што за сваё выступленне Міхаіл Мясніковіч паплаціцца пасадай прэм'ер-міністра. Другая частка назіральнікаў, аднак, лічыць падзеі апошніх дзён не больш як старанна змадэляваным адміністратыўнымі ідэолагамі піяр-ходам і ніякіх перамен да лепшага, у тым ліку эканамічных, не чакае.

### Як мінімум стагнацыя

Былы міністр сельскай гаспадаркі РБ Васіль Лявонаў, які ў свой час дабіваўся рыначных пераўтварэнняў у эканоміцы, але патрапіў на 3 гады ў турму, прызнаецца, што за пікіроўкай урада і Адміністрацыі асабліва пільна не сачыў, аднак, па вялікім рахунку, згодны з дзеючым прэм'ерам.

— Мясніковіч ведае, што гаворыць, — кажа Лявонаў. — Я даўно ведаю яго і паважаю як прафесіянала, чалавека дзелавога і кваліфікаванага. А вось хто такі Ткачоў? Дзе ў Канстытуцыі сказана, што дарадца прэзідэнта мае права публічна ўказваць і даводзіць ураду што б то ні было? Мясніковіч, на маю думку, яшчэ вельмі мякка адрэагаваў на заўвагі Ткачова. Я, напэўна, увогуле выправіў бы памочніка прэч. Але, у прынцыпе, ніводны з іх усё адно нічога ў дадзенай сітуацыі не вырашае, рашэнне суцэльна залежыць ведама ад каго.

— Як вы лічыце, калі трэба было б выключыць друкарскі станок і згарнуць дзяржаўныя датацыі, каб не дапусціць таго ўзроўню інфляцыі, які мы маем сёння?

— Гэта не трэба было рабіць з самага пачатку. Але тэрмінова згортваць усю гэтую лавачку неабходна было пасля выбараў, калі людзі страцілі давер да заяў улады і пайшлі ў тыя абменнікі па грошы. Нічога зроблена не было, як, зрэшты, не зроблена і на бягучы момант, бо друкарскі станок — гэта толькі адно пытанне з вялікага кола. Што будзе далей? Ці дасягне курс долара 22 тысяч рублёў, як гэта прагназуе ўрад? Ці перавысіць гэтую лічбу? Цяжка прадказаць. Як мінімум, нас чакае стагнацыя, а потым, магчыма, і поўны калапс эканомікі. Асабіста я нічога станоўчага не чакаю, паколькі агульны курс не мяняецца, а правадыр, відавочна, не зусім адэкватна ацэньвае абставіны, у якіх сёння апынуўся ён сам і ўвесь народ.

### ДАСЛОЎНА

На апошнім пасяджэнні Савета Міністраў яго кіраўнік Міхаіл Мясніковіч звярнуўся да памочніка прэзідэнта Сяргея Ткачова:

— Вы так актыўна дапамагалі фарміраваць усе праграмы... Цягам апошніх 10–15 гадоў... На 2011 год у планы ў якасці крыніц фінансавання будаўніцтва 7,5 млн квадратных метраў жылля, малочна-таварных ферм, свінагадоўчых комплексаў і цэлага шэрагу іншых праграм было закладзена... нуль рублёў. Нуль!

**Вікторыя ПРАКАПОВІЧ, http://www.svabodaby.net**

ПАЛІТЫЧНЫ ПЕРАСЛЕД



# МОГУЦЬ ДАДАЦЬ АРТЫКУЛ 193.1

КІРАЎНІКУ ПРАВААБАРОНЧАГА ЦЭНТРУ «ВЯСНА» АЛЕСЮ БЯЛЯЦКАМУ НА СУДОВЫМ ПРАЦЭСЕ, ЯКІ ЎЗНАЎЛЯЕЦЦА 16 ЛІСТАПАДА, МОГУЦЬ ВЫСТАВІЦЬ НОВЫЯ АБВІНАВАЧАННІ. ПРА ГЭТА 14 ЛІСТАПАДА ЗАЯВІЎ НА ПРЭСАВАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ Ў МЕНСКУ ПРАВААБАРОНЦА ЎЛАДЗІМЕР ЛАБКОВІЧ. ЁН ЛІЧЫЦЬ, ШТО ДА ЦЯПЕРАШНІХ АБВІНАВАЧАНЬНЯЎ МОГУЦЬ ДАЛУЧЫЦЬ І АРТЫКУЛ 193.1 КРЫМІНАЛЬНАГА КОДЭКСУ.

Артыкул 193.1 прадугледжвае пакараньне за дзейнасьць ад імя афіцыйна не зарэгістраванай у Беларусі грамадзкай арганізацыі. На мінулым пасяджаньні ў справе Бяляцкага пракурор папрасіў перапынак, каб сфармуляваць новае абвінавачваньне — кажа Уладзімер Лабковіч: «Абсалютна відавочна, што справа аб ухіленьні ад падаткаў развалілася. Таму мы не выключаем, што дзеля замацаваньня сваёй пазыцыі і рэпрэсіяў супраць Алеся Бяляцкага і «Вясны» яму можа быць прад'яўлена дадатковае абвінавачаньне як раз па артыкуле 193.1. Усе экспэрты і назіральнікі, якія прысутнічалі на апошнім судовым пасяджаньні, адзначалі — 90 працэнтаў таго, што гаварылася там, тычылася не так званых рахункаў Бяляцкага, а дзейнасьці праваабарончага цэнтру «Вясна».

Аднак наяўнасьць артыкула 193.1 не адпавядае міжнародным прававым стандартам, да якіх далучылася і Беларусь.

Пра гэта гаворыцца ў «Заключэньні аб адпаведнасьці артыкула 193.1 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь датычна правоў незарэгістраваных аб'яднаньняў міжнародным стандартам правоў чалавека». Заключэньне падрыхтавала і прыняла Эўрапейская камісія за дэмакратыю праз права. У гэтым дакумэнце адзначаецца, што такі артыкул «робіць дзейнасьць незарэгістраваных аб'яднаньняў па сутнасьці немагчымай, а значыць, па сутнасьці, абмяжоўвае права на свабоду асацыяцый».

**Уладзімер Глод.**

ТАКОЕ "СВЯТА"

# БЕЛАРУСАЎ ПАВІНШАВАЛІ З ВЯЛІКІМ І ЖАХЛІВЫМ

СВЯТА КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ ЯШЧЭ БОЛЬШ УНІКАЛЬНЫ, ЧЫМ ЛІТАРА «Ў»: ЁН НАЛЕЖЫЦЬ ТОЛЬКІ БЕЛАРУСАМ. НАВАТ РАСІЯ, ДЗЕ, УЛАСНА, І ПАЛЬНУЛА «АЎРОРА», АД ГЭТАЙ ЧЫРВОНАЙ ДАТЫ АДМОВІЛАСЯ. ТАК ВОСЬ І СВЯТКУЕМ ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ ЭКСТРЭМІСЦКАЙ ГРУПОЎКІ БАЛЬШАВІКОЎ У СУСЕДНЯЙ КРАІНЕ.

Вышэйшае кіраўніцтва суха павіншавала суайчыннікаў наборам казённых слоў. Іронія гісторыі яшчэ і ў тым, што рэвалюцыя для цяперашніх беларускіх уладаў - гэта жах, які ляціць на крылах ночы.

«Арабская вясна» толькі абвастрыла гэтыя фобіі, у чым публіка пераканалася на прыкладзе нядаўніх вучэнняў беларускай тэрытарыяльнай абароны, пераўтвораных у мілітарысцкай шоў.

Вярхоўны галоўнакамандуючы пры гэтым выкрыў заходнікаў у тым, што яны дзень і ноч праводзяць мазгавыя штурмы «з вельмі правакацыйнай парадкам дня: як зрабіць рэвалюцыю ў Беларусі».

Так навошта ж уладам гэта свята з ненавісным словам «рэвалюцыя» ў назве?

### Рымейк СССР не атрымаўся

«Гэта і на самай справе пацешны парадокс - улада, які праклінае рэвалюцыі, вядзе свой радавод ад ледзь ці не самай татальнай рэвалюцыі ў гісторыі чалавецтва, якія праліў рэкі крыві і радыкальна памяняў векавы ўклад», - адзначыў у інтэрв'ю для Naviny.by палітычны аналітык Юрый Дракахруст .

Зрэшты, дадаў ён, сучасная Беларусь і сапраўды многае успадкоўвае ў той рэвалюцыі. Доля прыватнага сектара ў ВУП тут складае толькі 30%, у той час як ва ўсіх суседніх краінах - больш за 60%. Па словах эксперта, «беларуская эканоміка шмат у чым застаецца адзяржаўленаю, сацыялістычнай. І няроўнасць у Беларусі сапраўды меншае, чым у іншых постсавецкіх краінах «.

Лукашэнка шчыра стараўся зрабіць нейкі міні-рэмейк СССР, але гэта не атрымалася, адзначыў, у сваю чаргу, эксперт мінскага аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Валерый Карбалевіч.

У каментары для Naviny.by палітолаг падкрэсліў: у пачатку праўлення свята Вялікага Кастрычніка сапраўды прыносіў першаму беларускаму прэзідэнту палітычныя дывідэнды. Тады народ настальгаваў па СССР, разгульвалася карта «брацкага яднання» з Расеяй.

Пад гэтую марку аднавілі, злёгку перацэлівав, герб і сцяг БССР. І 7 лістапада зноў зрабіў чырвоным днём календара не хто іншы, як Лукашэнка ў 1995 годзе (у пачатку 90-х, падчас «разгулу нацыяналістаў», гэтую чырвоную дату пахерылі).

Але сёння рыторыкай а-ля Вялікі Кастрычнік які ўпаў ніжэй плінтуса рэйтынг не падымеш. Калі ветэранаў Айчыннай хоць жменька засталася, то сучаснікі штурму Зімовага даўно сышлі ў свет іншай. А тых, хто прыйшоў сёння 7 лістапада да помніка Леніну ў Мінску членаў КПБ маладыя людзі закідалі яйкамі.

### У пасцы папулізму

Дарэчы, іншыя блізкія да цяперашняй улады палітолагі называлі перамогу Лукашэнкі ў 1994 годзе беларускай рэвалюцыяй. Сапраўды, гэты электаральны выбух мог наменклатуру Кебіча, якую экспансіўны дэпутат з Шклоўскага раёна абвінавачваў у адрыве ад народа, карупцыі, мафіёзная і інш

Але калі гэта была рэвалюцыя, то паралелі з бальшавіцкай гісторыяй можна працягнуць. Ленінцы зрынулі цара пад лозунгам «Улада - народу», аднак потым пераварылі выбары ў фарс. Не знаходзіце аналогій?

Далей: бальшавікі перамаглі пад лозунгам сацыяльнай справядлівасці, але замест выгод камунізму рабацяг чакалі чэргі за эрзац-каўбасой, у той час як функцыянеры шыта-крыта атрымлівалі сервелата ў спецраспределителях.

Цяпер чэргаў няма, але кошты на сервелата для сярэдняга беларуса - адвал башкі. Нават па афіцыйнай статыстыцы інфляцыя з пачатку года падабралася пад 90%. Пры гэтым ёсць падставы падазраваць, што рацыён жыхароў «царскіх сеў» наўрад ці моцна высілілася. Інфляцыйны жа падатак - гэта вам любы эканаміст растлумачыць - плаціцы ў першую чаргу бедныя. Здуліся, карацей, і беларуская сацыяльная мадэль.

Макраэканамічны прагноз на 2012 год, які цяпер рыхтуе ўрад, «выглядае жорстка і ў значнай ступені разбурае ідэю сацыяльнай дзяржавы», адзначыў Валерый Карбалевіч. І дадаў: зрэшты, гэта пакуль не зацверджана.

Адмыслоўцы не ўпэўнены, што ў будучым годзе ўлада ўтрымаецца ад спакусы падпечатать грашанят, каб злёгку задобрыць масу. Але гэта з фінансава-эканамічнага пункту гледжання - як доза для наркамана. Потым будзе ламаць яшчэ страшней. Фінансісты называюць гэта раскруткай інфляцыйнай спіралі.

Карацей, «народная ўлада» - у пасткі эканамічнага папулізму.

### Бальшавізм жывы

Магчыма, беларускае начальства трымаецца за 7 лістапада яшчэ і таму, што пераканаўчых новых свят не прыдумала. Няма ідэй. Спробы самотужно скляпаў нейкую афіцыйную ідэалогію праваліліся.

Беларусам прапаноўваюць жудасны канцэптуальны вінегрэт. Глядзіце: з аднаго боку, Пуцін і Лукашэнка паўтараюць, што распад СССР - трагедыя. З іншага боку, у віншаванні беларусаў з нагоды цяперашняй даты апяваецца «імкненне народаў да самавызначэння і незалежнасці на роднай зямлі».

Так усё-ткі, крах «саўка» - трагедыя ці доўгачаканы трыумф права народаў на самавызначэнне? А вось як выгадна гэтую хвіліну, так нашы мудрыя правадыры і тлумачаць.

«Мне здаецца, улады проста не ведаюць сёння, што з гэтым рэвалюцыйным святам рабіць», - лічыць Валер Карбалевіч.

Падобна, проста не да ідэалогіі цяпер. Таго і глядзі, казённых прапагандыстаў, спевакоў «беларускай мадэлі» таксама пачнуць закідваць тухлымі яйкамі.

А наогул, рыторыка кіраўніцтва становіцца ўсё больш жорсткай. І дамінуе ўжо не падлашчванне з масамі, а застрашванне. На нядаўніх вучэннях сілавікам аддадзены загад «забыцца такія паняцці, як прыстойна-непрыстойна». Пры тым што і дагэтуль у залішняй цырымоніі іх было цяжка папракнуць.

На думку Карбалевіча, з пункту гледжання інтарэсаў утрымання ўлады ўсё лагічна: калі аўтарытарны лідэр становіцца непапулярным, «паслабленне народнай легітымнасці кампенсуецца сілавым кампаніям».

Ды ўжо, зацягніце хто сёння з бадуна на вуліцы савецкі казённы хіт «І юны кастрычнік наперадзе» - глядзіш, можна і ў каталажку дагадзіць за заклік да рэвалюцыі.

У прынцыпе, уся ідэалогія беларускага кіраўніцтва звялася цяпер да банальнага ўтрымання ўлады любым коштам. Што, зрэшты, выглядае цалкам па-бальшавіцкай.

**Аляксандр Класкоўскі, БелаПАН, naviny.by**

НАША КІРАЎНІЦТВА

# НАЁМНІКІ ЛУКАШЭНКІ

Гэта унікальны выпадак у Еўропе XXI стагоддзя. Аднаму чалавеку падпарадкоўваюцца выканаўчая, заканадаўчая і судовая ўлада. Ён жа прызначае кіраўнікоў выбарчай камісіі і ўсіх вялікіх СМІ. Калі ён да кагосьці звяртаецца на нарадзе, той абавязаны ўскочыць. Яго сын Коля ў вайсковай форме прымае парад побач з татам, і генералы аддаюць ім чэсць.

І, аказваецца, такі султанат можа быць стабільнай формай кіравання ў эпоху айфонаў. Доза прапаганды, доза рэпрэсій — і вялікая частка насельніцтва лічыць, што яму пашанцавала.

Я запытаўся аднаго венесуэльскага палітолага, дзеля чаго Чавэс спансаруе Лукашэнку. «Бо ўзамен Лукашэнка перадае веды, як утрымліваць уладу». А гэта дарагога варта.

Сярод ноу-хау Лукашэнкі — пастаноўка ўсіх дзяржаўных інстытутаў у залежнасць ад сябе і мэтаскіраванае аслабленне тых грамадскіх структур, якія падпарадкаваць сабе не ўдалося.

Лукашэнка прыйшоў да ўлады, абапіраючыся на палітыкаў і чыноўнікаў з пакалення, што вырасла за Гарбачова. Яны прывыклі да самастойнасці і вялі сябе як свабодныя грамадзяне. Некаторыя нават наіўна спадзяваліся «перарасці свайго шэфа» і ўзначаліць краіну самім.

Лукашэнку прыйшлося ўжыць крайнія меры, каб дасягнуць «стабільнасці». Першы прэм'ер-міністр пры Лукашэнку, Чыгір апынуўся ў турме. Старшыня парламента Шарэцкі вымушаны быў эміграваць, як і лідар пазапарламенцкай апазіцыі Пазняк. Віцэ-прэм'ер Ганчар і міністр унутраных спраў Захаранка зніклі: імаверна, іх забілі.

Лукашэнка зрабіў свае высновы з першых гадоў свайго кіравання.

Надалей ён стараўся не дапускаць, каб у краіне з'яўляліся іншыя яркія асобы з палітычным значэннем.

Пасля гэтага ўсе прэм'ер-міністры і кіраўнікі палат парламента былі людзьмі старэйшымі за Лукашэнку, па запамінальнасці роўнымі вядру. Але асабліва цікавы быў ягоны падыход да выбару кіраўніцтва сілавых ведамстваў. На сёння ніхто з кіраўнікоў чатырох асноўных сілавых структур: Службы бяспекі прэзідэнта, Камітэта дзяржаўнай бяспекі, Міністэрстваў унутраных спраў і абароны — не нарадзіўся ў Беларусі. Усе яны родам з іншых краін былога СССР. Яны расейцы? — запытаецеся вы. Не, яны савецкія людзі. Пераважна вайскоўцы і дзеці вайскоўцаў, у якіх малой радзімай была не нейкая нацыя, а вайсковыя лагеры імперыі.

Кіраўніца Цэнтрвыбаркама Ярмошына — з такіх жа.

Гэта былі людзі, для якіх распад СССР быў трагедыяй не толькі геапалітычнай, але і асабістай. Яны падтрымлівалі савецкага папуліста Лукашэнку, бо баяліся застацца чужымі ў новых нацыянальных дзяржавах. Але ў выбары легіянераў быў і яшчэ адзін рэзон.

**Міністры абароны, унутраных спраў, кіраўнікі КДБ і Службы аховы прэзідэнта – усе яны нарадзіліся не ў Беларусі.**

Згодна з законамі Беларусі, неўраджэнец не мае права стаць прэзідэнтам краіны. Такім спосабам Лукашэнка засцерагаецца ад узнікнення ўнутры сістэмы постаці, якой бы стукнула ў галаву скінуць дыктатара сілай.

Нешта падобнае было ў султанаў — янычары. У той жа логіцы мысліў Кадафі, які стварыў асабістую ахову з жанчын.

У адрозненне ад іншых сучасных еўрапейскіх дзяржаваў, якія грунтуюцца перадусім на пачуцці нацыянальнай салідарнасці, культурнага адзінства, лукашэнкаўская дзяржаўнасць трымаецца ў большай ступені на вернасці феадалу або страху перад ім.

Аднак і султан урэшце робіцца залежным ад сваіх наймітаў.

Гэта і ёсць мінай запаволенага дзеяння пад беларускую дзяржаўнасць.

Краіна страчвае мову, не мае якараў у ЕС і НАТО.

Паказальна, што ў Маскве пасля адстаўкі аселі былы шэф лукашэнкаўскай адміністрацыі і міністр замежных справаў Латыпаў, былыя шэфы КДБ Мацкевіч і Ерын, былы міністр унутраных спраў Навумаў. Яны працуюць там у непразрыстых пуцінскіх бізнэс-структурах.

Лукашэнкаўская мадэль дыктатуры зрабіла нашу цэнтральнаеўрапейскую дзяржаву татальна залежнай ад Расіі і ў бяспецы, і ў эканоміцы, і ў кадравым плане.

**Андрэй Дынько, "Наша Ніва".**

НАША КУЛЬТУРА

# ГНАНЫЯ Ў БЕЛАРУСІ "ЛЯПІСЫ" ЗНЯЛІ КЛІП "НЯ БЫЦЬ СКОТАМ!"



Кампазіцыя напісана на вершы класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы («Хто ты гэткі?»).

Спачатку Сяргей Міхалок проста чытаў іх на канцэртах, піша Рух.by.

«Я доўга не мог падступіцца да гэтага вершу, бо тут у некалькіх радках закладзены эпас і гісторыя цэлага народа, - распавядае Сяргей Міхалок. - Мяне патрэсла, што вершы, напісаныя шмат гадоў назад і якія былі ў той час злабадзённымі і сфакусаваўся на рэальнай жыцця, і сёння гучаць вельмі актуальна. Пацешна, што Купала можа падказаць ўсім беларусам, што рабіць і як жыць тут і цяпер - прычым лепш, чым любыя прамовы сучасных палітыкаў. У яго вершах закладзена нейкая агульначалавечая канцэпцыя, якая выходзіць за рамкі сённяшняга дня, таму цяпер для мяне «не быць быдлам» - гэта галоўны дэвіз «.

«Ляпісы» выконваюць гэтую песню на канцэртах у Расіі і Украіне, бо ў Беларусі яны пад забаронай. А лідэрам групы Сяргеем Міхалком зацікавілася Генпракуратура - з-за інтэрв'ю з рэзкай крытыкай Аляксандра Лукашэнкі. Угледзелі абразу кіраўніка дзяржавы. Музыку чакаюць на допыт, а інтэрв'ю адпраўлена на лінгвістычную экспертызу.

### Не быць скотам

*Хто ты гэткі?*
*Свой, тутэйшы!*
*Чаго хочаш?*
*Долі лепшай!*
*Якой долі?*
*Хлеба, солі!*
*Чаго болей?*
*Зямлі, волі!*
*Прыпеў:*
*Хлеба, солі!*
*Зямлі, волі!*
*Хлеба, солі!*
*Зямлі, волі!*
*Дзе нарадзіўся?*
*У сваёй вёсцы!*
*Дзе хрысціўся?*
*Пры дарожцы!*
*Чым асвенчан?*
*Кроўю, потам!*
*Чым быць хочаш?*
*Не быць скотам!*
*Прыпеў:*
*Кроўю, потам!*
*Не быць скотам!*
*Кроўю, потам!*
*Не быць скотам!*
*Хто ты гэткі?*
*Свой, тутэйшы!*
*Чаго хочаш?*
*Долі лепшай!*
*Якой долі?*
*Хлеба, солі!*
*Чаго болей?*
*Зямлі, волі!*
*Прыпеў:*
*Хлеба, солі!*
*Зямлі, волі!*
*Кроўю, потам!*
*Не быць скотам!*
*Хлеба, солі!*
*Зямлі, волі!*
*Кроўю, потам!*
*Не быць скотам!*
*Не быць скотам!*
*Не быць скотам!*
*Не быць скотам!*
*Не быць скотам!*
*Не быць скотам!*
*Не быць скотам!*

**"Ляпис Трубецкой"**

БЕЛАРУСЬ І СВЕТ

# ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР БЕЛАРУСІ - КАНДЫДАТ НА ПАТРАПЛЕННЕ Ў "ЧОРНЫ СПІС" ЕС

Спіс неўязных у краіны Еўрасаюза беларускіх чыноўнікаў можа пашырыцца ў самы бліжэйшы час. Зараз у ім 245 прозвішчаў на чале з Аляксандрам Лукашэнкам.

EUobserver піша, што «ёсць яшчэ шмат людзей, якія могуць быць туды дададзены. Кіраўнікі дыпмісій у Мінску працуюць увесь час, адпраўляючы спісы патэнцыйных неўязных у Брусель. Новыя імёны могуць з'явіцца ў «чорным спісе» ў бліжэйшыя некалькі дзён ці тыдняў».

Паведамляецца, што прэтэндэнтамі на патрапленне туды сталі прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч, віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка і кіраўнік Дзяржпагранкамітэта Ігар Рачкоўскі - за тое, што «непасрэдна ўдзельнічаюць у схемах асабістага ўзбагачэння Лукашэнкі».

У «чорны спіс» могуць трапіць і некалькі алігархаў - напрыклад, Юрый Чыж. Візавыя санкцыі дакладна пашырацца, калі будзе асуджаны кіраўнік Праваабарончага цэнтра «Вясна» Алесь Бяляцкі.

ДЭМАКРАТЫЧНЫ РУХ

# УЛАДА ЦЯГНЕ БЕЛАРУСЬ НАЗАД

Каментуючы крытыку Аляксандрам Лукашэнкам празмернай рынкавасці дзеянняў ураду, лідар Руху "За Свабоду" Аляксандр Мілінкевіч адзначае, што перспектывы адстаўкі ўраду заўсёды ёсць, бо некага ж трэба лічыць вінаватым. Толькі не Лукашэнку. "І гэта ўсё вельмі сумна, бо нам якраз патрэбныя вельмі хуткія рэформы, безумоўна, балючыя. І без гэтых рэформаў будзе дэградацыя і грамадства, і гаспадаркі. Таму неадэкватныя дзеянні звязаныя таксама з няпоўнай інфармацыяй, якую мае кіраўніцтва Беларусі. На жаль, і статыстыка часта падпарадкоўваецца мэтазгоднасці. Беларусь застанецца эканамічным ізгоем у цэнтры Еўропы. Усе краіны, лепшыя, горшыя, рэформы зрабілі, рухаюцца наперад. А мы будзем спрабаваць ісці назад", - сказаў Мілінкевіч у інтэрв'ю радыё "Свабода".

# АКТЫВІСТ ПРОСІЦЬ ВЫДАЦЬ ЯМУ СНАЙПЕРСКУЮ ВІНТОЎКУ

Гомельскі актывіст Руху «За Свабоду», пенсіянэр Уладзімір Няпомняшчых звярнуўся з пісьмовай заявай да старшыні аблвыканкаму Ўладзімера Дворніка з просьбай «залічыць у тэрытарыяльныя войскі».

Як паведамляе Радыё Свабода, актывіст просіць выдаць яму «снайпэрскую вінтоўку, а лепш — гранатамёт».

У заяве першы добраахвотнік мясцовых тэрытарыяльных сілаў патлумачыў, што на такі крок яго натхніў выступ па тэлебачаньні галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі Беларусі, прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі. І асабліва ягоныя словы пра стварэньне «новай арміі» і пра тое, што «ядром такіх фармаваньняў павінны быць бізнэсмэны».

Спадар Няпомняшчых піша, што яму таксама ёсьць што абараняць: «Я раней быў індывідуальным прадпрымальнікам (бізнэсоўцам), хаця называўся «вашывай блахой». Сабраў капітал у беларускіх рублях, які захоўваецца ў самым надзейным банку сьвету — «Беларусбанку».

Добраахвотнік перакананы, што зь яго прыходам у тэрытарыяльныя войскі Гомельшчыны сюды ня сунуцца ніякія «казлы», ніякія «адмарозкі», ніякая «пятая калёна».

«У міліцыі я быў капітанам, а ў тэрытарыяльнай абароне гатовы служыць нават шарагоўцам», — зазначае Ўладзімер Няпомняшчых.



**Заснавальнік:** Сяржук Салодкі
**Рэдактар:** Аляксандр Шчамлёў
**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы. Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742
**Наклад:** 290 асобнікаў. Выдаецца пры падтрымцы сяброў. Распаўсюджваецца бясплатна